Источник: "Краязнаўчая газета" - 2014-03-13

## Нашы спачуванні

Грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», «Краязнаўчая газета» з жалем паведамляюць аб смерці доктара мастацтвазнаўства, вядомага этнамузыколага **Зінаіды Якаўлеўны МАЖЭЙКІ** і выказваюць глыбокія спачуванні родным і блізкім нябожчыцы.



8 сакавіка 2014 г. на 81 годзе пайшла з жыцця вядучы беларускі этнамузыколаг, вядомы славіст і беларусіст, доктар мастацтвазнаўства Зінаіда Якаўлеўна Мажэйка.

У галіне фундаментальнай навукі З. Мажэйка пакінула шмат працаў, якія ўвайшлі ў «залаты фонд» славянскай музычнай фалькларыстыкі і ў многім вызначылі той высокі ўзровень этнамузыкалогіі, што быў дасягнуты ў другой палове XX – пачатку XXI стагоддзя.

У галіне практычнай фалькларыстыкі З. Мажэйка першай у Беларусі пачала сцвярджаць ідэю неабходнасці папулярызацыі музычнага фальклору на навуковай аснове і стварыла канцэпцыю самадастатковасці музычнай культуры вуснага тыпу. Ёю распрацаваная праграма па аўдыявізуальнай антрапалогіі, па ўласных сцэнарыях знятыя сем дакументальных музычна-этнаграфічных кінастужак. Як навуковец з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй З. Мажэйка востра ставіла праблему неабходнасці экалагічнай абароны вясковай народна-песеннай культуры.

Заслугі З. Мажэйкі адзначаныя званнем заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі (1987), Дзяржаўнай прэміяй Беларусі (1994), Прэміяй імя Б. Асаф'ева (1991).

Светлая памяць аб Зінаідзе Якаўлеўне назаўсёды захаваецца ў сэрцах яе паплечнікаў і аднадумцаў, тых, каму пашчасціла працаваць разам з гэтай яскравай, неардынарнай асобай.

*Адміністрацыя і супрацоўнікі Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, калегі, сябры*

"Краязнаўчая газета". Нашы спачуванні